# ЛЯЛЬКА ЯК З'ЯВА КУЛЬТУРЫ Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

*С.У. Касцюкевіч*
*(Полацкі дзяржуніверсітэт, г. Навапалацк)*

У цацках дзяцей усіх кантынентаў прысутнічае выява чалавека. Лялька – гэта цацка, але яе нельга выключаць з іншых сфер чалавечага жыцця, яна звязана з абрадамі, вераваннямі, культамі, магіяй, таксама як з мастацтвам, модай. Ёй прысвечана вялікая колькасць навуковых доследаў і мастацкіх твораў, кожны з іх прадстаўляе свой новы погляд і трактоўку. Так пісаў аб «праблеме лялькі» Ян Буяк -- выбітны знаўца еўрапейкага цацачнага промыслу. Па-сутнасці, лялька вынікае з праблем экзістэнцыі чалавека як істоты біялагічнай і сацыяльнай. Ад лялькі пачынаецца эмацыянальная «адукацыя» дзіцяці, ад яе пачынаецца будучая жанчына, маці, бабуля. Лялька прыходзіць з моманту нараджэння, і яна – ёсць першая старонка «кнігі жыцця». Першыя лялькі знаходзяць з найстаражытнейшых часоў археолагі. Большасць даследчыкаў схіляюцца да думкі, што першапачатковай функцыяй іх была магічная.

Аб магічнай практыцы мы можам даведацца з «Права» Платона, відавочна, што гэтая цацка была вельмі папулярнай у старажытным Рыме і Грэцыі, на Цейлоне, у Індыі, Ісландыі і Егіпце. Этнаграфічныя даследаванні падцвярджаюць распаўсюджанне магічных рэтуалаў з лялькай на абшарах Еўропы, абедзвюх Амерык, Аўстраліі і Афрыкі. Гэтая з'ява стала прадметам навуковых даследаванняў. Магічная функцыя лялькі вынікае з розных сімвалаў у некаторых абрадах. Тут можна казаць аб ёй як сімвале плоднасці і абаронцы сям'і падчас вясельных абрадаў. У некаторых славянскіх народаў, напрыклад, нявесце на вяселле клалі ляльку мужчынскага полу на калені, у іншых вешалі над галавой ці ставілі на стале, альбо вельмі часта падобная выява з'яўлялася на вясельным пірагу. Звычай той у некалькі трансфармаванай форме дажыў да нашага часу. Прыбраную ў народныя ці вясельныя строі ляльку прывязваюць да машыны, што вязе маладых да шлюбу. Рэтуальная лялька часта ператваралася ў ляльку-цацку.

Гэта быў натуральны працэс ператварэння сакральнага ў прафаннае, ён павінен дапамагчы ва ўстанаўленні хранапагічных крытэрыяў і правядзенні даследчых працэдур над генезісам лялькі. Зменнасць функцыі лялькі відавочна бачна ва ўзаемным пранікненні лялькі-цацкі і рэлігійнай лялькі. Падобная з'ява характэрна для тых рэлігій, дзе прымальнымі лічацца выявы людзей. Лялькі, якія сінтэзавалі ў сябе рэлігійную і забаўляльную функцыі з'явілася ў сувязі з прыгатаваннем дзяцей для рэлігійнага культу. Гэта лялькі ў народных і рэлігійных строях, што служылі для ўпрыгожвання хатніх алтароў, навагодніх ёлак, ложкаў, тапчанаў і г.д. Найбольш верагодна, першыя лялькі-мадэлі з'явіліся ў Францыі. Гістарычная інфармацыя аб французскай лялцы паходзіць з сярэднявечча і датычыцца галоўным чынам цацак для каралеўскіх дзяцей. Першую ляльку на кані з першым зброяносцам у 1444 годзе атрымала дачка караля. То быў пачатак знакамітых паэней у гісторыі лялек-мадэляў. Кацярына Медзічы мела 16 лялек, восем з якіх насілі жалобу, княжна Д'Енгіен мела пакой з шасцю лялькамі прадстаўляўшымі цяжарную кабету, дзіця, акушэрку, мамку, няньку і бабку.

З таго часу лялькі прыбраныя ў народныя строі свайго часу сталі сімвалам Францыі, яны рассылаліся ў іншыя краіны ў каралеўскія двары і былі ўзорам высокай французскай моды. Яны выконвалі ролю модных часопісаў. Тыя лялькі былі настолькі папулярнымі, што людзей, якія іх перавозілі «апекуноў лялек» прапускалі праз межы без адпаведных мытных даглядаў нават падчас войнаў. Ад XV ст. на тэрыторыі Германіі трапляюцца нам пісьмовыя і іканаграфічныя матэрыялы, што сведчаць аб нараджэнні тут вырабу цацак. З 1484 года паходзіць старадрук «Hortus Sanitas», у якім прадстаўлены з выявамі вырабляемых лялек і візітоўкамі іх творцаў з ваколіц Нюрынберга. Нюрынбергскі

асяродак лічыцца першым цацачным асяродкам, а разам з тым гэта найбольш вядомы асяродак у Еўропе XV–XIX стст. Асяродак існуе да сённяшняга часу, негледзячы на тое, што яго значэнне знізілася з-за распаўсюджання вырабаў японскіх, амерыканскіх, французскіх і ганконгскіх фабрык цацак. Трэба ўзгадаць і аб той сенсацыі ў грамадстве, якая пачалася ў недрах французскага рынку і якую зрабіла эмігрантка з Амерыкі.

«Барбі», якая з'явілася ў 1959 годзе ў ЗША на вялікай цацачный фабрыцы «Matel», Яна маланкава заваявала сваім абаяннем і прыгажосцю ўсе кантынены свету. Першыя згадкі аб цацках Расіі мы знаходзім у спісе выдаткаў жонкі цара Міхаіла Фёдаравіча, якая купіла лялькі і тканіны на сукенкі для іх, а таксама вазок з коньмі, драўляных конікаў і птахаў. У 1721 годзе мы сустракаем іншы запіс аб пакупках жонкі Пятра I Кацярыны: тры каровы, коні, бараны, алені, лебедзі, трое дзяцей, горад з войскам. Пётр I і яго прыдворныя добра ставіліся да цацак. Найвялікшым і найзнакаміцейшым цацачным асяродкам у Расіі быў Загорск. Ангельскія лялькі «маладзейшыя» за іншых, гэта тлумачыцца мабыць ізаляцыяй Англіі ад еўрапейскага кантыненту. Выраблядь цацачную прадукцыю на туманнай высле пачалі два роды: Пьероціч і Монтанарыч, якія верагодней за ўсё прыбылі з Італіі. Дзякуючы ім пачалі вырабляць такія лялькі, якія яшчэ не сустракаліся на кантыненце. Для італьянскіх лялек XVII і XVIII стст. – гэта эра расквіту.

Яны пакарылі свет сваёй незвыклай элегантнасцю і пекнасцю. Першае апісанне лялькі знаходзім у інвентарным апісанні пасагу княжны Элеаноры Д'Эстэ ў 1484 годзе. Несумненна, вялікая значэнне для сусветнага рынку маюць чэшскія цацкі. Галоўныя асяродкі вырабу цацак знаходзяцца на тэрыторыі Чэшска-Мараўскага узвышша, у заходняй Чэхіі. У Славакіі найвялікшымі асяродкамі былі Кунезаў, Старая Тура, Кьятыце. У большасці гэтых асяродкаў выраблялі драўляныя цацкі. Першымі выраб цацак пачалі на тэрыторыі Маравіі і Чэхіі ветэраны напалеонаўскіх войнаў. Тэрыторыя Венгрыі вядома сваімі тэатральнымі лялькамі, марыянеткамі і народнымі строямі для лялек, Швейцарыя славіцца механічнымі лялькамі. Некалькі слоў трэба сказаць аб ляльках з прастораў Даніі, Галандыі, Бельгіі. Гэтыя тэрыторыі былі пад безумоўным уплывам цацачнага промыслу Германіі і Францыі. Зацікаўленасць цацкамі тут узнікла адносна позна ад XIX да XX стст. Данія дзякуючы вынаходніцтву Хрысціянсена праславілася сваім «Лего». Нешмат матэрыялаў маем мы з Пірэнейскай паўвыспы, хаця лялькі у гішпаньскіх строях запоўнілі вялікія абшары Еўропы. Найбольш вядомы пекныя лялькі-карапузы фірмы Бер'юза, належачыя фірме Рампор.

Хацелася б сказаць некалькі слоў і аб польскім цацачным промысле, асабліва той яго часткі, якая датычыцца вырабу лялькі. Найбольш цікавымі лічацца цацкі дзяцей Яна III Сабескага. Яны сведчаць аб тым, што ў Польшчы, падобна як у іншых краінах сярэднявечнай Еўропы распаўсюджаны былі ўзоры нямецкіх і французскіх цацак. Лялькі можна было набыць на таргах і ярмарках, а таксама ў спецыялізаваных магазінах Львова, Кракава, Познані, Варшавы. Цацкі выраблялі ў некалькіх асяродках такіх, як: кракаўскі, варшаўскі, чэнстаховіцкі, жывецкі, келецкі. На тэрыторыі Беларусі цацкі трапляюць, пачынаючы з неаліту, г.зн. часу пашырэння ў першабытных плямёнаў керамікі. Разнастайныя і багатыя знаходкі зроблены пры раскопках гарадзішчаў жалезнага веку. Асабліва цікавая калекцыя дробнай пластыкі – каля 100 фігурак і фрагментаў – знойдзена на Падняпроўі. Магічная роля была асноўнай для фігурных вырабаў. Згодна са старажытнымі вераваннымі, свістулькі адганялі злых духаў, фігуркі людзей абазначалі продкаў, свойскіх жывёл ляпілі і надзеі паўплываць на дабрабыт. Мініяцюрныя скульптуркі знаходзяць пры раскопках многіх гарадоў Беларусі.

Так, фрагменты гліняных цацак X–XIII стст. былі знойдзены пры раскопках старажытных Пінска, Ваўкавыска, Гродна, Менска, Полацка і інш. Да іх адносяцца, акрамя лялькі, коннікі. Менавіта ў іх праяўляюцца новыя цікавыя рысы народнага мастацтва. Такія цацкі найбольш падвяргаюцца ўздзеянню часа, асаблівасцям быту і густу. Яшчэ

паўвека назад на перніках у Оршы былі традыцыйнымі выявы «жытняй бабы» у арэоле з зерня і зорак – атрэбутаў пакравіцельніцы земляробства. Сёняшнія ж лялькі «апрануты» па сучаснай модзе і вельмі ярка адлюстроўваюць асаблівасці сучаснага жыцця. На Беларусі не склалася цацачных асяродкаў, як у Расіі ці Польшчы, выраб лялькі насіў спадарожны характар. Аднак, народная лялька тут мае свой непаўторны характар. Росквіт лялечнай вытворчасці прыпадае на XIX ст., як і ў іншых краінах Еўропы.